УДК 947.6

# Рээвакуацыя беларускіх бежанцаў Першай сусветнай вайны ў межах савецкай міграцыйнай палітыкі (1918–1923 гг.)

***Карнялюк В.Р.***
*Установа адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы", Гродна*

*У артыкуле на падставе спецыяльных даследаванняў і новых архіўных крыніц Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі праанализаваны падзеі рээвакуацыі беларускіх бежанцаў Першай сусветнай вайны ў межах савецкай міграцыйнай палітыкі ў 1918–1923 гг.*

*Мэта – праанализаваць працэс рээвакуацыі беларускіх бежанцаў Першай сусветнай вайны ў межах савецкай міграцыйнай палітыкі (1918–1923 гг.)*

***Матэрыял і метады.*** *На падставе новых гістарычных крыніц Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, найперш фонду Беларускага Нацыянальнага Камісарыята, і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі зроблена спроба аналізу дадактовых акалічнасцяў і наступстваў вяртання беларускіх бежанцаў у ходзе ажыццяўлення савецкай міграцыйнай палітыкі.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Аўтарам акрэслены асноўныя падыходы ў ажыццяўленні такой міграцыйнай палітыкі, звернута ўвага на поўную падпарадкаванасць дзеянняў міграцыйных службаў БССР расійскім і агульнасаюзным структурам. Аўтар робіць выснову аб тым, што пасля захопу ўлады бальшавікамі рээвакуацыя эвакуіраваных і бежанцаў беларускіх губерняў часоў Першай сусветнай вайны ў 1918–1923 гг. савецкімі органамі ажыццяўлялася ў поўным падпарадкаванні патрабаванням кіраўніцтва РКП(б).*

***Заключэнне.*** *Па шэрагу праанализаваных у даследаванні прычын беларускія нацыянальныя палітычныя дзеячы хаця і займаліся бежанскім пытаннем, але не мелі магчымасці павярнуць велізарную масу бежанцаў-беларусаў у накірунку нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва.*

*Пасля захопу ўлады бальшавікамі рээвакуацыя эвакуіраваных і бежанцаў беларускіх губерняў часоў Першай сусветнай вайны ў 1918–1923 гг. савецкімі органамі ажыццяўлялася ў поўным падпарадкаванні патрабаванням кіраўніцтва РКП(б).*

***Ключавыя словы:*** *рээвакуацыя, беларускія бежанцы, Першая сусветная вайна, савецкая міграцыйная палітыка.*

*(Ученые записки. – 2018. – Том 28. – С. 28–32)*

# Re-evacuation of Belarusian Refugees in World War I as Part of the Soviet Migration Policy (1918–1923)

***Karnialiuk V.G.***
*Educational Establishment "Grodno State Yanka Kupala University", Grodno*

*On the basis of special researches and new archival sources of the National Archive of the Republic of Belarus and the State Archive of the Russian Federation, the article analyzes the events of re-evacuation of Belarusian refugees of the First World War in the framework of the Soviet migration policy in 1918–1923.*

*The aim is to analyze the process of re-evacuation of Belarusian refugees of the First World War within the framework of the Soviet migration policy (1918–1923).*

***Material and methods.*** *On the basis of new historical sources from the National Archive of the Republic of Belarus, primarily the Fund of the Belarusian National Commissariat, and the State Archive of the Russian Federation we have made an attempt to analyze additional circumstances and consequences of the return of Belarusian refugees as an implementation of Soviet migration policy.*

***Findings and their discussion.*** *The author outlines the main approaches in the implementation of the migration policy, attention is drawn to the complete subordination of the actions of the migration service of the Byelorussian SSR to the Russian, and later – to the Union one. The author concludes that after the seizure of power by the Bolsheviks the reevacuation of evacuees and refugees of Belarusian provinces during the First World War in 1918–1923 by Soviet authorities was conducted according to the requirements of the RCP(b) leadership.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: zrumljowa@mail.ru –* ***В.Р. Карнялюк***

***Conclusion.*** *The analyzed causes illustrate that Belarusian national political figures, although engaged in refugees issue, were not able to turn a huge mass of Belarusian refugees in the direction of the national state-building.*

*After the seizure of power by the Bolsheviks the reevacuation of evacuees and refugees of Belarusian provinces during the First World War in 1918–1923 by Soviet authorities was conducted according to the requirements of the RCP(b) leadership.*

***Key words:*** *re-evacuation, Belarusian refugees, World War I, Soviet migration policy.*

*(Scientific notes. – 2018. – Vol. 28. – P. 28–32)*

Падчас і пасля заканчэння польска-савецкай вайны працэс вяртання бежанцаў і эвакуіраваных Першай сусветнай вайны набыў самыя вялікія памеры. Паколькі пасля Рыжскага дагавора ўся тэрыторыя былой Гродзенскай і Віленскай губерняў была ў складзе Польшчы і Літвы, то большасць рэпатрыянтаў трапляла ў новыя для іх дзяржавы. Розныя аспекты гэтага міграцыйнага працэсу знайшлі адлюстраванне ў работах А. Бабкова, М. Галас, А. Цiхамiрава, В. Цынкевiча [1–4]. Для ацэнкі вынікаў і наступстваў рээвакуацыі бежанцаў-беларусаў неабходна мець на ўвазе дзве акалічнасці гэтага працэсу. Па-першае, гэтае тое, што пытаннямі рэпатрыяцыі і рээвакуацыі ў савецкай Расіі займаўся Цэнтрэвак НКУС РСФСР, у структуры якога пры ўрадзе БССР было створана рэспубліканскае ўпраўленне па эвакуацыі – Белэвак [2, с. 108]. Агульнарасійская ўстанова складала агульныя планы перавозак рэпатрыянтаў, кiравала фінансаваннем эваворганаў, размеркаваннем ім матэрыяльных сродкаў. Такая цэнтралізацыя з’яўлялася часткаю ўсталяванай ад пачатку савецкай улады агульнай аўтарытарнай сістэмы кіравання, была звязана з агульнасцю эвакуацыйна-транзітных шляхоў і накіравана на ўнітарны характар узаемаадносін Масквы і асобных, фактычна несамастойных, савецкіх рэспублік [2, с. 108]. Па-другое, правядзенне міграцыйнай палітыкі савецкай улады насіла комплексны характар, з практычным улікам самых розных – эканамічных, знешне- і ўнутрыпалітычных фактараў. Ад пачатку ўзровень дзяржаўнага адміністравання савецкіх бежанскіх устаноў зверху данізу падчас арганізацыі рээвакуацыі быў непараўнальна вышэйшым за адпаведныя намаганні ў 1918 г. лідараў БНР.

Мэта – прааналізаваць працэс рээвакуацыі беларускіх бежанцаў Першай сусветнай вайны ў межах савецкай міграцыйнай палітыкі (1918–1923 гг.)

**Матэрыял і метады.** На падставе новых гістарычных крыніц Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, найперш фонду Беларускага Нацыянальнага Камісарыята, і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі намі зроблена спроба аналізу дадактовых акалічнасцяў і наступстваў вяртання беларускіх бежанцаў у ходзе ажыццяўлення савецкай міграцыйнай палітыкі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Адразу адзначым, што вымушаныя мігранты разглядаліся савецкай уладай як чалавечы рэсурс, якім можна скарыстацца ва ўмовах грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі, а таксама глыбокага эканамічнага крызісу. Як вядома, Цэнтрпалонбеж загадваў мясцовым савецкім органам не ўключаць у спісы бежанцаў прызыўнога ўзросту. Эмісар Смаленскага аддзялення Белнацкама ў сваёй справаздачы ў кастрычніку 1918 г. прыводзіць прыклад гвалтоўнай мабілізацыі бежанцаў-беларусаў у Чырвоную Армію (калі сярод чырвонаармейцаў, якія былі забіты і без весткі прапалі, у спісах «Известий» Смаленскага Савета ад 24 кастрычніка 1918 г. – 99% жыхары акупаваных тэрыторый і толькі 1% – велікаросаў), што “павінны былі ісці служыць за савецкую ўладу, пакінуўшы на палове шляху свае сем’і” ў прамежкавых “перасылках”, літаральна “пад адкрытым небам” [5, арк. 22]. Разам з тым органамі Усерасійскай Надзвычайнай Камісіі ў складзе “бежанцаў выяўляліся ўрачы, інтэлігенцыя, ваенныя спецыялісты, кваліфікаваныя рабочыя, якія не дапускаліся да рэпатрыяцыі” [2, с. 106, 108]. Красамоўным прыкладам такой падкрэсленай увагі да спецыялістаў можа быць архіўная “Справа аб Зенгбушы”. Яна змяшчае шырокую перапіску наконт Іосіфа Паўлавіча фон Зенгбуша, жыхара г. Гродна, высакакласнага спецыяліста з адукацыяй Межавога інстытута і вялікім досведам працы, які, маючы на руках польскую візу, цягам чатырох месяцаў не атрымліваў дазвол ад самых розных дзяржаўных савецкіх устаноў на рэпатрыяцыю [6, арк. 76–111].

Арганізацыя вяртання вымушаных мігрантаў патрабавала каардынацыі дзейнасці савецкіх міграцыйных структур з адпаведнымі структурамі Польшчы і Літвы. Кожная краіна мела свае падыходы да рэпатрыянтаў, таму час вяртання бежанцаў стаў часам сутыкнення інтарэсаў усіх удзельнікаў гэтага міграцыйнага працэсу. Справамі рэпатрыяцыі ў Польшчы займалася Дзяржаўнае ўпраўленне па справах вяртання вязняў, бежанцаў [4, с. 77]. Таксама тым, хто вяртаўся, дапамагалі

дабрачынныя арганізацыі, сярод якіх найбольшай актыўнасцю выдзяляўся Амерыканскі Камітэт Дапамогі дзецям. Сваю ролю ў гэтай справе адыгралі дзеянні АРА (Амерыканскай Адміністрацыі Дапамогі). Як заўважае В. Саматыя, дапамога даходзіла да бежанцаў праз дзейнасць Польскай і Рускай АРА, а пазней савецкага аддзялення гэтай арганізацыі, якія акрамя забеспячэння Польшчы, у тым ліку і Заходняй Беларусі пасля Рыжскага дагавора, і РСФСР займаліся дастаўкай і размеркаваннем грузаў на тэрыторыі БССР і УССР [7, с. 63].

Вярталіся бежанцы рознымі шляхамі і відамі транспарту. Разумеючы гэта, Цэнтрпалонбеж запланаваў толькі на першую палову 1919 г. выдаткаваць на арганізацыю перамяшчэння мігрантаў чыгункай 20 000 000 рублёў, рачным транспартам – 1 000 000 руб., грунтавымі дарогамі – 3 000 000 руб. Акрамя таго, на гэты перыяд Цэнтрпалонбеж вымушаны быў запланаваць 6 000 000 руб. на дапамогу рээвакуіраваным мігрантам [8, арк. 355 адв.]. Гэта тлумачыцца наступным: ад пачатку сваёй міграцыйнай палітыкі савецкая ўлада адмовілася ад выдачы пайкоў бежанцам, што пагоршыла і без таго цяжкі стан вымушаных мігрантаў.

Хаця рээвакуацыя ў час польска-савецкай вайны не прыпынялася, яе ходу перашкаджалі баявыя дзеянні і палітыка новай акупацыйнай улады на беларускіх землях. Вясна 1919 г. стала часам прыняцця чарговых экстранных мер, накіраваных на ўрэгуляванне бежанскага руху ў раёне Заходняй вобласці. З Цэнтрэвака ў губернскія і павятовыя эвакуацыйныя камітэты ішлі наступныя тыповыя адказы: “Паведамце бежанцам…, што адпраўка іх у раён Заходняй вобласці пакуль не магчыма з-за ваенных дзеянняў з Польшчай” [9, арк. 6, 11, 32, 37, 41, 43, 55]. Згодна з мікрадаследаваннем дакументаў перапіскі Асобага Аддзела Усерасійскай Надзвычайнай Камісіі і ўстаноў Цэнтрэвака за перыяд з 6 чэрвеня па 16 жніўня 1920 г. адмовы ў руху бежанцаў, абумоўленыя падзеямі польска-савецкай вайны, зафіксаваны 16 разоў [9, арк. 6, 11, 13, 32, 41, 42, 43, 44, 45, 47, 49, 55, 57, 65, 80, 89]. Гэтыя цяжкасці рээвакуацыі чаргаваліся з перыядамі, калі бежанцаў прапускалі праз лінію фронту, што, у сваю чаргу, цягнула чараду дзеянняў, накіраваных на інфармаванне і тлумачэнне становішча ў самых розных частках савецкай Расіі і іншых рэгіёнах былой імперыі, дзе знаходзіліся бежанцы, падрыхтаваныя да вяртання. Інструментамі для такога тлумачэння выступалі мясцовыя мітынгі, сходы і друк. Толькі падобныя мерапрыемствы па каардынацыі вяртання дапамагалі часткова. Даведзеныя да адчаю бежанцы, каб паскорыць час вяртання, неаднаразова адрасавалі свае запыты да самых высокіх чыноў савецкай Расіі: У. Леніна і Л. Троцкага [10, арк. 26 адв., 28, 38, 50 адв., 51 адв.].

2 мая 1919 г. у Мінску адбылося аб’яднанае пасяджэнне Галоўнай Камісіі апекі аб палонных і бежанцах, разам з прадстаўнікамі Мінскай Губернскай Калегіі, Наркамздрава Мінскага накірунку, Мінскага Упраўлення Чырвонага Крыжа, Галоўнай Місіі Чырвонага Крыжа, Акругі Шляхоў Зносін, Камісарыята Сацыяльнага Забеспячэння, Акруга-Транспартнага аддзелу Мінскай Надзвычайнай Камісіі. Па выніках аналізу сітуацыі канцэнтрацыі некалькіх дзясяткаў тысяч бежанцаў у раёнах станцый Замір’е (Гарадзея) і Стаўбцы (8,5 тыс.), Слуцк (4 тыс.), Лунінец (5 тыс.), на іншых станцыях, у тым ліку і ў Мінску, а таксама стварэння Саветам Абароны супраць бежанцаў загараджальных атрадаў у раёне Барысава і Асіповічаў было прапанавана, у прыватнасці, звярнуцца да Цэнтрпалонбежа і Наркамшляху, каб прыпыніць перамяшчэнне бежанцаў у раён на мяжы з ваеннымі дзеяннямі, а да Савета Абароны – аб ліквідацыі загараджальных атрадаў як меры неэфектыўнай. Узамен гэтага было вырашана паспрабаваць узмацніць бежанскія пункты і прыёмнікі, больш дасканала ўзгадняць з ваеннымі працэдуру адпраўкі бежанцаў праз лінію фронту, у большай ступені абаперціся ў вырашэнні бежанскага пытання на грамадскія арганізацыі, якія былі зацікаўлены ў гэтым [11, арк. 88–88 адв.]. Было вырашана ўсталяваць дэзінфекцыйныя атрады для ўсяго раёна заходніх абласцей Чырвонага Крыжа, стварыць урачэбна-харчавальныя пункты ў Бельску, Брэст-Літоўску, Кобрыне, Гарадцы, Гарадзішчы, Янаве, Замір’і, Пінску, Гомелі, Лунінцы, Гродна, Баранавічах з прапускной магчымасцю ад 1000 да 6000 чалавек [11, арк. 103]. У шпіталях, у тым ліку тых, што дзейнічалі пад эгідай Чырвонага Крыжа, якія размяшчаліся, у прыватнасці, у Дзвінску, Мінску, Гомелі, Вільна, Гродна, з даволі вялікай колькасцю коек – ад 1000 да 4000 – часам не знаходзілася месца для ўсіх бежанцаў з-за перапоўненасці савецкімі вайскоўцамі [11, арк. 103].

Напрыканцы 1920 г. у час савецка-польскіх дыпламатычных стасункаў на прадмет польска-савецкіх меж, пытанне, у якую менавіта дзяржаву трапяць рээвакуіраваныя бежанцы з беларускіх зямель, заставалася адкрытым. Дакладнасці ў гэтым пытанні не было нават тады, калі 2 лістапада 1920 г. прадстаўнікі краін-удзельніц Рыжскага прэлімінарнага дагавора абмяняліся

ў Лібаве ратыфікацыйнымі граматамі [3, с. 56]. У дадатак да мірных дагавораў РСФСР яшчэ раней заключыла дагаворы аб рээвакуацыі бежанцаў з Латвіяй ад 12 чэрвеня 1920 г. і з Літвой ад 30 чэрвеня 1920 г. Напярэдадні, 28 чэрвеня 1921 г., было падпісана пагадненне з Літвой аб парадку агітацыі літоўскага грамадзянства [2, с. 107].

Яшчэ большыя памеры рээвакуацыя набыла пасля 24 лютага 1921 г., калі Пагадненне аб рэпатрыяцыі паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай, з другога боку, было падпісана. Вядома, што колькасць людзей, якіх неабходна было абмяняць з абодвух бакоў, істотна адрознівалася. Па ацэнцы старшыні двухбаковай змешанай Спецыяльнай Камісіі па вяртанні закладнікаў, палонных, інтэрніраваных, бежанцаў і эмігрантаў І. Лорэнца, якая дзейнічала ў Рызе, колькасць асоб, што трэба было рэпатрыіраваць, уключаючы бежанцаў, з тэрыторыі Расіі і Украіны было ў 15–20 разоў больш, чым з тэрыторыі Польшчы. Становішча палепшылася з заключэннем Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. Гэтаму садзейнічаў і змест артыкула VI Рыжскага дагавора, у якім, як нагадвае В. Цынкевіч, было вызначана шырокае кола асоб, што маюць права набыцця польскага і, наадварот, расійскага і ўкраінскага грамадзянства. Паводле дагавора, асобы, якія дасягнулі на момант яго ратыфікацыі 18-гадовага ўзросту і “прыпісаныя да адной з гарадскіх, вясковых ці саслоўных супольнасцяў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, што ўвахо дзяць у склад Польшчы”, лічыліся грамадзянамі Польшчы, калі яны ва ўсталяваным дагаворам парадку аптацыі выказвалі на тое сваё пажаданне. Яны набывалі права “бесперашкоднага выезду ў дзяржаву, на карысць якой апціравалі, разам з маёмасцю” [4, с. 77].

Паводле дадзеных А. Бабкова на забеспячэнні Белэвака ў ліпені-жніўні 1921 г. штодзень знаходзілася ў сярэднім да 4,4 тыс. бежанцаў [1, с. 14]. Для абмену ваеннапалоннымі і бежанцамі былі вызначаны толькі два пераходы – па лініях Роўна–Шапятоўка і Мінск–Баранавічы. В. Цынкевіч нагадвае пра створаныя загараджальныя атрады для змяншэння “самацёку” ўцекачоў да мяжы ў Мінск [4, с. 77]. Працэс абмену паміж РСФСР і Польшчай не прыпыняўся і напрыканцы 1921 г. За перыяд з 20 верасня па 31 снежня 1921 г. праз розныя эвакпункты Галоўэвака, па выніках нашага мікрагістарычнага аналізу, прайшло 235465 чалавек, якія рухаліся самі па сябе, на фурманках і з баракаў, што былі пры эвакпунктах [9, арк. 1–89 (падлік наш. – *В.К.*)].

Трэба адзначыць, што падчас усяго перыяду, вяртання сам рух замаруджваўся з-за недахопу кадраў з беларускага боку. Мірныя ўмовы пасляваеннага жыцця, з разбуранай эканомікай, новай савецка-польскай мяжой спрыялі росквіту кантрабандызму, у якім “сваё месца займалі і ніжэйшыя супрацоўнікі эвакаў”. Практыка суправаджэння эшалонаў з рээвакуіраванымі патрабавала, каб “у кожную змену пропуск эшалона забяспечвалі пяць чалавек (камендант, намеснік, фельчар і два санітары)”. Пры той інтэнсіўнасці руху, які быў у 1921–1923 гг., адпаведных кадраў проста не хапала [12, арк. 2]. Адсутнасць дыпламатычнага прадстаўніцтва Польшчы ў Мінску, якое, згодна з высновай В. Цынкевіча, не было ўсталявана з-за супраціву Масквы, таксама не спрыяла паскарэнню працэсу перамяшчэння рээвакуіраванага насельніцтва заходніх зямель Беларусі [4, с. 81]. Расійскае, а потым саюзнае савецкае кіраўніцтва ўсе аспекты працэсу рээвакуацыі трымала пад няўхільным кантролем, дзякуючы чаму Мінск стаў выключна месцам тэхнічных працэдур арганізацыі вяртання мас бежанцаў.

З другога боку, павелічэнню эфектыўнасці вяртання і пропуску рээвакуіраванага насельніцтва спрыяла тое, што “з ліпеня 1921 г. у Мінск прыехалі ўжо пастаянныя ўпаўнаважаныя расійска-ўкраінскай і польскай камісій, каб адкрыць аддзяленне змешанай камісіі па рэпатрыяцыі па Заходняй вобласці і БССР (ад кожнага боку – 1 упаўнаважаны і 4 чалавекі дапаможнага персаналу). Упаўнаважаныя мелі наступныя правы і абавязкі: нагляд за рэпатрыяцыяй мігрантаў, складанне спісаў памерлых, нагляд за выкананнем пагаднення аб рэпатрыяцыі, дапамога і апякунства над бежанцам, наведванне лагераў, турмаў. Яны таксама мелі права непасрэднага звароту да мясцовых улад па вышэйпералічаных пытаннях, права пасрэдніцтва ў перапісцы рэпатрыянтаў з Польшчай, у тым ліку пры перасылцы дакументаў для рэпатрыяцыі, разглядзе скаргаў, у тым ліку ад ваеннапалонных. Усе справы вырашаліся па ўзгадненні двухбаковай камісіі. Функцыі агульнай канцылярыі выконвала канцылярыя расійска-ўкраінскай дэлегацыі. Польскія прадстаўнікі мелі права накладвання віз на спісы і аказання матэрыяльнай дапамогі. У падкантрольную акругу ўпаўнаважаных увайшлі БССР, Віцебская, Гомельская і Смаленская губерні РСФСР” [4, с. 77].

Заканчэнне вайны сведчыла пра неабходнасць інтэнсіўных дзеянняў па адпраўцы мігрантаў у Польшчу. Такая адпраўка суправаджалася вырашэннем пытанняў аптацыі мігрантаў.

Гэтае даволі канфліктагеннае пытанне было звязана з узаемнай падазронасцю як савецкага, так і польскага бакоў. Тым не менш, паводле аналізу В. Цынкевіча, "упаўнаважанымі змешаных камісій па рэпатрыяцыі была зроблена значная праца па садзейнічанні выезду бежанцаў. З сакавіка па кастрычнік 1921 г. у Мінску былі складзены спісы на выезд 116911 бежанцаў [4, с. 78]. Большасць з накіраваных у Польшчу бежанцаў былі выхадцамі з Заходняй Беларусі, сярод іх пераважалі беларусы [1, с. 158].

Аб тым, што катастрафічныя ўмовы вяртання былі ўласцівы для перамяшчэння розных груп мігрантаў, сведчаць дакументы, якія адлюстроўваюць рээвакуацыю менавіта эвакуіраваных груп насельніцтва беларускіх губерняў. У лісце ад 8 кастрычніка 1922 г. служачых Гомельскага чыгуначнага вузла, былых палескіх і прывісленскіх чыгунак, ад імя больш чым 600 чалавек, адрасаваным у Гомельскі губэвак, у якасці галоўных аргументаў выступае халодная пара года, якая набліжалася і пагражала гібеллю хворым і знямоглым бежанцам [7, арк. 61].

Хаця асноўная маса бежанцаў з'ехала ў Польшчу да канца 1922 г., у 1923 г. гэты працэс яшчэ працягваўся і быў звязаны з новымі абставінамі працэдуры рээвакуацыі. В. Цынкевіч адзначае такія адметнасці гэтага апошняга этапу, як "заканчэнне дзейнасці змешаных рэпатрыяцыйных камісій, перадачу справы вяртання астатніх грамадзян Польшчы ў веданне паўпрэдства РСФСР у Польшчу, прыпыненне эшалоннай адпраўкі з Расіі ў Польшчу, увядзенне новага парадку афармлення бежанскага білета з польскай і савецкай візамі" [4, с. 78].

**Заключэнне.** Працэс рээвакуацыі беларускага насельніцтва, які скончыўся ў 1923 г., стаў асобным этапам усяго міграцыйнага руху, выкліканага падзеямі Першай сусветнай вайны. Яго час ахапіў, з аднаго боку, перыяд рэвалюцыйнай чарады змены ўлад і няспынных ваенных дзеянняў, звязаных з рознымі ўзброенымі канфліктамі, а з другога – уздым палітычнага беларускага нацыянальнага руху, пачатак новага дзяржаўнага будаўніцтва. Усё пералічанае мела непасрэднае ўздзеянне на характар, тэмп і вынікі вяртання вымушаных мігрантаў. Таксама на гэтае вяртанне меў уплыў увесь назапашаны за гады эпохі бежанства вопыт ажыццяўлення новай міграцыйнай палітыкі, які, пры даволі розных мэтах разнастайных палітычных улад, улічваўся і выкарыстоўваўся імі.

Адначасова на працягу ўсяго перыяду рээвакуацыі ўдзел бежанцаў у рэвалюцыйных падзеях насіў абмежаваны характар і быў акрэслены пераважна інтарэсамі вяртання дадому і ратаваннем сваіх родных і маёмасці. Менавіта такія прапановы бежанцы бачылі прывабнымі сярод заклікаў і зваротаў розных палітычных і грамадскіх арганізацый. Ва ўмовах знішчаных рэвалюцыйным крызісам вынікаў сацыяльнай адаптацыі маса бежанцаў, якую было цяжка кантраляваць і каардынаваць, не стала аб'ектам мэтанакіраванай увагі з боку тых ці іншых сіл. Бежанскае пытанне заўсёды стаяла на перыферыі запланаваных дзеянняў палітычных арганізацый. Бежанцы палохалі іх сваёй этнічнай і сацыяльнай разнастайнасцю і звязанасцю з комплексам бытавых праблем, якія з'яўляліся прыярытэтнымі для апошніх у параўнанні з пытаннямі нейкага палітычнага ўплыву.

Па шэрагу прааналізаваных у даследаванні прычын беларускія нацыянальныя палітычныя дзеячы хаця і займаліся бежанскім пытаннем, але не мелі магчымасці павярнуць велізарную масу бежанцаў-беларусаў у накірунку нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва.

Пасля захопу ўлады бальшавікамі рээвакуацыя эвакуіраваных і бежанцаў беларускіх губерняў часоў Першай сусветнай вайны ў 1918–1923 гг. савецкімі органамі ажыццяўлялася ў поўным падпарадкаванні патрабаванням кіраўніцтва РКП(б).

## Літаратура


1. Бабков, А. Деятельность Белорусского управления по эвакуации населения (январь-август 1921 г.) / А. Бабков // Изв. Гомел. гос. ун-та имени Ф. Скорины. Сер., Гуманитар. науки. – 2011. – № 5(68). – С. 14.
2. Галас, М. Государственно-институциональная и социальная адаптация репатриантов и реэвакуируемых беженцев в России в 1920-е гг. / М. Галас // Власть. – 2011. – № 4. – С. 105–108.
3. Тихомиров, А. Проблемы определения восточной границы Польши в 1920 – начале 1921 г. / А. Тихомиров // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2004. – № 2. – С. 56.
4. Цынкевіч, В. Праблема рэпатрыяцыі бежанцаў і адкрыццё польскага консульства ў Мінску (1921–1924 гг.) / В. Цынкевіч // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2001. – № 3. – С. 77.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, г. Мінск (далей НА РБ, г. Мінск). – Фонд 4. – Воп. 1. – Адз. зах. 41.
6. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, г. Масква (далей ДА РФ, г. Масква). – Фонд Р3333 с. – Воп. 3. – Адз. зах. 225.
7. Саматыя, В. Деятельность АРА по оказанию помощи беженцам на территории Беларуси / В. Саматыя // Журнал международного права и международных отношений. – 2005. – № 2. – С. 62–65.
8. ДА РФ, г. Масква. – Фонд Р3333. – Воп. 7. – Адз. зах. 2.
9. НА РБ, г. Мінск. – Фонд 39. – Воп. 1. – Адз. зах. 427.
10. ДА РФ, г. Масква. – Фонд 130. – Воп. 4. – Адз. зах. 285.
11. ДА РФ, г. Масква. – Фонд Р3341. – Воп. 2. – Адз. зах. 61.
12. ДА РФ, г. Масква. – Фонд Р3333. – Воп. 3. – Адз. зах. 70.


*Паступіў у рэдакцыю 06.09.2018 г.*